**19.** Як найчасцей пачынаюцца народныя казкі? Дапоўніце выраз: *жыў дзед, жыла ... .*

**А)** царэўна. **Б)** баба. **В)** прыгажуня.
**Г)** прынцэса. **Д)** чараўніца.

**20.** Назвы склонаў маюць пэўны парадак. Вызначце правільны варыянт.

**А)** назоўны, месны, давальны, родны, творны, вінавальны.
**Б)** родны, вінавальны, давальны, назоўны, месны, творны.
**В)** месны, родны, назоўны, давальны, вінавальны, творны.
**Г)** назоўны, родны, вінавальны, давальны, творны, месны.
**Д)** назоўны, родны, давальны, вінавальны, творны, месны.

**21.** Вучні павінны былі выбраць з прапанаваных слоў назвы птушак, якія гняздуюцца на тэрыторыі Беларусі: *1) пелікан; 2) жаўранак; 3) калібры; 4) ластаўка; 5) кнігаўка; 6) пінгвін.* Які правільны варыянт выбралі вучні?

**А)** усе словы. **Б)** 1, 3, 4. **В)** 2, 4, 5. **Г)** 3, 6. **Д)** 4, 5.

**22.** Хто найчасцей у сваёй мове выкарыстоўвае наступныя словы: *каталог, фармуляр, стэлаж, абанемент*?

**А)** настаўнік. **Б)** урач. **В)** паштальён.
**Г)** бібліятэкар. **Д)** аптэкар.

**23.** Выберыце з прапанаваных словы, у склад якіх уваходзіць спалучэнне літар ***«прыз»***:

*1) прызёр; 2) прызямліцца; 3) капрызулька;*
*4) сюрпрызы; 5) прызыў.*

**А)** усе словы. **Б)** 1, 2, 3. **В)** 2, 4, 5. **Г)** 3, 4. **Д)** 5.

**24.** Закончыце народную прымаўку: *запас бяды ... .*

**А)** не шукае. **Б)** не адганяе. **В)** не чыніць.
**Г)** не марнуе. **Д)** не адмаўляе.

---

Конкурс арганізаваны і праводзіцца Грамадскім аб'яднаннем «Беларуская асацыяцыя «Конкурс» сумесна з Акадэміяй паслядыпломнай адукацыі пад эгідай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

220013, г. Мінск, вул. Дарашэвіча, 3–218
тэл. (017) 292 80 31, 292 34 01, 290 01 53
e-mail: info@bakonkurs.by
http://www.bakonkurs.by/

ГА «БА «Конкурс». Заказ 9. Тыраж 22600 экз. г. Мінск. 2009 г.

Конкурс па беларускай мове

# «БУСЛІК-2009»

*Чацвер, 19 лютага 2009 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- карыстацца падручнікамі, канспектамі, справачнай літаратурай забараняецца;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (8 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 8 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 8 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- няправільны адказ адзначаецца чвэрцю балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, і залічваецца са знакам «мінус», у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 24 балы;
- максімальная колькасць балаў, якую можа атрымаць удзельнік конкурсу, – 120;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем застаецца ўдзельніку.

---

## Заданне для вучняў 3-4 класаў

**1.** Вучні павінны былі выбраць з прапанаваных слоў *яблык, маліна, вішня, сліва, суніцы* толькі тыя, якія называюць ягады. Надзея сказала, што патрэбна выбраць *ўсе словы*; Міхалка – толькі словы *яблык* і *вішня*; Аленка – *маліна* і *суніцы*; Раман – *вішня* і *суніцы*; Каця – *маліна* і *сліва*. Хто з вучняў адказаў правільна?

**А)** Надзея. **Б)** Міхалка. **В)** Аленка. **Г)** Раман. **Д)** Каця.

**2.** У старажытныя часы, калі яшчэ не было кнігадрукавання, чыталі творы:

**А)** перапісаныя ад рукі. **Б)** надрукаваныя ў часопісах.
**В)** з дапамогай камп'ютэра. **Г)** з дапамогай магнітафона.
**Д)** пазычаныя ў суседа.

**3.** Колькі назоўнікаў адзіночнага ліку ўжыта ў вершаваных радках А. Астрэйкі?

*На лясных палянках*
*выспелі суніцы.*
*На калгасным полі*
*жыта каласіцца.*

*Цэлы дзень не ціхнуць*
*песні над ракою.*
*Пахнуць сенажаці*
*звялаю травою.*

**А)** 3. **Б)** 4. **В)** 5. **Г)** 7. **Д)** 9.

**4.** Дадзены сказы:
*1) Дзесьці закукавала зязюля, пачуўшы птушыныя спевы.*
*2) Світанак.*
*3) Вось заспяваў салавей.*
*4) Сымонка пачаў слухаць, як прачынаецца лес.*
*5) Яму адазвалася берасцянка.*
Перастаўце сказы так, каб атрымаўся тэкст.
**А)** 1, 2, 3, 4, 5. **Б)** 2, 4, 3, 5, 1. **В)** 3, 2, 1, 4, 5.
**Г)** 4, 1, 5, 3, 2. **Д)** 4, 5, 1, 3, 2.

**5.** Выберыце з дадзеных прыкладаў тыя словы, якія маюць усе мяккія зычныя: *1) дзянькі; 2) сяджу; 3) яблыня; 4) сліва; 5) бяліць; 6) вішня.*
**А)** усе словы. **Б)** 1, 3, 6. **В)** 1, 5. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 5, 6.

**6.** Дадзены словы: *1) пальцы; 2) дзік; 3) корань; 4) пянькі; 5) дождж; 6) свой; 7) пальма*. Вызначце словы з літарай, якая не абазначае гука.
**А)** няма такіх слоў. **Б)** 1, 2, 4, 6. **В)** 1, 3, 4, 7.
**Г)** 2, 5, 6. **Д)** 3, 4, 7.

**7.** Прачытайце ўважліва вершаваныя радкі А. Дзеружынскага:
*На вярбіне коцікі,*
*жоўценькія роцікі,*
*Лапачкі пуховыя,*
*спіначкі шаўковыя.*
Колькі ў гэтым тэксце слоў, якія адрозніваюцца адной літарай?
**А)** няма такіх слоў. **Б)** 2. **В)** 4. **Г)** 6. **Д)** 8.

**8.** Прадоўжыце выраз: *гукі, якія ўтвараюцца толькі голасам, называюцца ... .*
**А)** літарамі. **Б)** зычнымі. **В)** зацвярдзелымі.
**Г)** галоснымі. **Д)** падоўжанымі.

**9.** Выберыце з прыведзеных прыкладаў назвы агародніны: *1) цыбуля; 2) сліва; 3) морква; 4) бурак; 5) агурок; 6) груша.*
**А)** усе прыклады. **Б)** няма такіх назваў.
**В)** 1, 3, 4, 5. **Г)** 2, 4, 5, 6. **Д)** 2, 6.

**10.** У якіх словах на месцы пропуску патрэбна пісаць літару ***я***?
*1) выц..раў; 2) дз..журны; 3) падм..тала;*
*4) в..сёлыя; 5) б..розка; 6) с..кунда.*
**А)** ва ўсіх словах. **Б)** 1, 3, 4, 6. **В)** 2, 3, 4, 5.
**Г)** 3, 4, 5. **Д)** 4, 6.

**11.** Выберыце з прыведзеных толькі тыя зычныя гукі, якія не маюць парнага мяккага гука: *1) [ф]; 2) [х]; 3) [р]; 4) [т]; 5) [ш]; 6) [с].*
**А)** няма такіх прыкладаў. **Б)** усе прыклады.
**В)** 1, 3, 4. **Г)** 2, 5, 6. **Д)** 3, 5.

**12.** У якіх словах з прыведзеных замест кропак неабходна ўставіць літару ***п***: *1) слу..; 2) зу..; 3) ду..кі; 4) скры..ка; 5) гры..кі?*
**А)** ва ўсіх словах. **Б)** 1, 2. **В)** 1, 4. **Г)** 2, 5. **Д)** 3, 5.

**13.** Вучні атрымалі заданне выбраць з прыведзеных слоў толькі тыя, дзе патрэбна паставіць замест кропак апостраф: *1) салаў..і; 2) вераб..і; 3) Мар..я; 4) Дзям..ян; 5) надвор..е.* Было прапанавана некалькі варыянтаў. Вызначце правільны адказ.
**А)** ва ўсіх словах. **Б)** ва ўсіх словах, акрамя 1.
**В)** 1, 3, 4. **Г)** 2, 5. **Д)** 2, 4.

**14.** Падбярыце патрэбны назоўнік да прыметнікаў *зялёная, пушыстая, высокая, стройная ... .*
**А)** вавёрка. **Б)** ліса. **В)** елка. **Г)** морква. **Д)** куніца.

**15.** Дадзены словы: *1) поўсць; 2) сабака; 3) футра; 4) боль; 5) поўнач; 6) стэп.* Выберыце толькі назоўнікі жаночага роду.
**А)** усе назоўнікі. **Б)** 1, 2, 4. **В)** 1, 5. **Г)** 2, 4, 5, 6. **Д)** 5, 6.

**16.** Маша з Аленай пасадзілі кветкі, а назвы іх зашыфравалі ў рэбусе. Разгледзьце рэбусы і вызначце толькі назвы кветак.
а = ў 1, 2, 4, 3 6 = ч ак , , , э = е на ж = р ы = а
1)  2)  3)  4)  5) 
**А)** 1, 2. **Б)** 1, 3, 5. **В)** 2, 4. **Г)** 2, 3, 5. **Д)** 3, 4.

**17.** Прачытайце шараду С. М. Шах:
*Вазьмі дзве ноты без памылкі*
*ды прыназоўнічак дабаў –*
*і вось будынак невялікі*
*ты сабе ўжо збудаваў.*
Знайдзіце адгадку у дадзеных літарах і спалучэннях літар, паставіўшы іх на патрэбнае месца: *1) па, рэ; 2) р, ту, фа, х; 3) мі, к, до; 4) ля, фа, со; 5) ля, до.*
**А)** 1. **Б)** 2. **В)** 3. **Г)** 4. **Д)** 5.

**18.** Падбярыце з прыведзеных патрэбныя прыметнікі, каб славесна «размаляваць» слова ***яблык***: *1) пушысты; 2) румяны; 3) спелы; 4) прамавугольны; 5) салодкі; 6) музычны.*
**А)** 1, 3, 4. **Б)** 1, 6. **В)** 2, 3, 5. **Г)** 3, 5. **Д)** 5.